7. Свод законов Российской империи, повелением гос. Имп. Николая Павловича составленный. Изд.1842 г. – СПб.: Тип. II отд. Собств. Его Имп. Вел. Канцел., 1842. – Т. II.

# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ФЕАДАЛЬНАЙ РЭНТЫ НА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – XVII стст.

**А. П. Лойка**

Другая палова XVI – XVII стст. бадай што самы драматычны і трагічны для беларускага народу. Лівонская вайна, казацкі тэрор, які падрываў моц Рэчы Паспалітай знутры, крывавая вайна з расійскай дзяржавай 1654-1667 гг. Па віне маскоўцаў-захопнікаў, што неслі па нашай зямлі смерць, гвалт, мор, беларусы згубілі больш за палову насельніцтва – 52,3 %[1, Mopzy J. Kryzys demograficzny na Litwie i Białorusi w II połowie XVII wieku. Poznań, 1965. S. 181].

Не складана ўявіць сабе наступствы ваенных ліхалеццяў сярэдзіны XVII ст. Выпаленныя населеныя пункты, дэпрэсія і, як вынік, – жудасны эканамічны крызіс, які не бачыла яшчэ зямля беларуская. Натуральна, што ўвесь цяжар па аднаўленню гаспадаркі Рэчы Паспалітай лёг на плечы звычайнага селяніна.

Сацыяльна-эканамічную аснову феадалізму складала сельскагаспадарчая вытворчасць, а менавіта сялянства з’яўлялася асноўным вытворчым класам гэтага грамадства. Таму асаблівую цікавасць уяўляе даследванне сацыяльна-эканамічных умоў жыцця «простага люду» і ў першую чаргу яго адносіны да асноўнага сродку вытворчасці феадальнага грамадства – зямлі.

Пры вывучэнні акрэсленай праблемы галоўнымі сярод гістарычных крыніц, натуральна, з’яўляюцца інвентарныя вопісы дзяржаўных, царкоўных і прыватных уладанняў

Інвентары дзяржаўных і прыватных уладанняў складаліся пры змене кіруючых адміністрацыйных асоб (старостаў, аканомаў, адміністратараў), перадачу зямель у арэнду ці пасля яе аканчэння, пад час рэвізій гаспадарчага стану дзяржаўных маёнткаў, часта пры іх продажы ці заставе. У цэнтры ўвагі складальнікаў інвентарных вопісаў была, як правіла, сялянская гаспадарка. Характарыстыка феадальна-залежнага насельніцтва вызначалася ў асноўным тым, якую гаспадарчую накіраванасць меў маёнтак, якая форма рэнты ў ім пераважала. Звычайна ў інвентарах насупраць кожнай улічанай сялянскай гаспадаркі запісваўся памер яе зямельнага надзелу, яго павіннасная структура (цяглы, чыншавы ці змешаны), ступень абкладання павіннасцямі.

Для выяўлення як падабенства, так і своеасаблівасцей гаспадарчага развіцця ў розных рэгіёнах Беларусі ўжываецца замацаванае ў гістарыяграфіі методыка падзелу краіны на эканоміка-геаграфічныя зоны. Заходнія і ўсходнія землі мелі шматлікія асаблівасці і іх супастаўленне ў працэсе вывучэння дазваляе не толькі падкрэсліць спецыфічныя рысы кожнай з іх, але і выявіць асноўную тэндэнцыю сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на пэўных этапах. У гістарычнай літаратуры пад усходам нашай Радзімы звычайна маецца на ўвазе тэрыторыя, далучаная да Расійскай імперыі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай 1772 года. У склад цэнтральнай зоны ўключаліся Менскі, Наваградскі і Мазырскі паветы. Такі падзел апраўданы толькі з некаторымі агаворкамі, прычым толькі для канца XVIII – першай паловы XIX стст. і не зусім правамерны для вывучаемага прамежку часу. Для гэтага ж перыяду пад усходнім рэгіёнам неабходна разумець тэрыторыю, на якой у другой палове XVI ст. яшчэ не была праведзена ў шырокіх маштабах валочная памера і якая вылучалася значнай эканамічнай своеасаблівасцю (перавага грашовай рэнты і даніны) у параўнанні з фальварачна-паншчынай сістэмай на захадзе і ў цэнтры Беларусі. Цалкам, на нашу думку, правільны падзел гаспадарчых зон па ўмоўнай лініі Орша – Барысаў – Менск – Слуцк – Пінск [2, Спиридонов М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV-XVIвв.). Мн., 1993. С. 93]. Цэнтр Беларусі як асобная эканоміка-геаграфічная зона вылучаецца не заўсёды. Гэта тлумачыцца некалькімі прычынамі. Па-першае, гаспадарчае развіццё заходніх і цэнтральных рэгіёнаў у многім падобна, а часам нават ідэнтычна. Таму даследчыкі часта не лічаць неабходным раз'ядноўваць іх. Па-другое, пры даследванні не заўсёды мажліва правесці паўнавартаснае параўнанне цэнтра з усходам і захадам з-за адсутнасці шырокага кола крыніц па гэтым рэгіёне. Напрыклад, большасць дзяржаўных уладанняў размяшчаліся на ўсходзе Беларусі. Цэнтр прадстаўлены адзінкавымі ўладаннямі, інвентары якіх сустракаюцца эпізадычна. Тое ж тычыцца і царкоўных уладанняў.

Выдзяляюць тры асноўныя віды феадальнай рэнты: адпрацовачную, грашовую і натуральную. У залежнасці ад формы эксплуатацыі вылучаюцца цяглыя, кунічныя (чыншавікі) сяляне і даннікі.

Да першай паловы XVII ст. адзначаецца далейшае павелічэнне нормаў паншчыны. Раслі яны ў дзяржаўных, царкоўных і прыватнаўласніцкіх уладаннях (як магнацкіх, так і ў маёнтках дробнай і сярэдняй шляхты). Прычым падымнае вызначэнне паншчыны ў гэты час стала даволі распаўсюджанай з'явай. Шэраг гісторыкаў адзначаюць, што ў заходніх і цэнтральных рэгіёнах Беларусі паншчына вырасла да сярэдзіны XVII ст.,

у параўнанні з сярэдзінай XVI ст. прыкладна ў два-тры разы [3, Лойка П. А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI – XVIIIстст. Мн., 1991. С.31].

Нормы штотыднёвай паншчыны на заходніх і цэнтральных абшарах Беларусі былі вышэйшымі, у параўнанні з усходнімі. Колькасць паншчыных дзён у тыдзень з валокі ў магнацкіх маёнтках была роўнай у сярэднім 3,7, а ў дробна- і сярэднешляхецкіх – 4,7 у цэнтральназаходнім рэгіёне; на ўсходзе ж аналагічныя паказчыкі па магнацкіх уладаннях – 2 дні, а па шляхецкім – 2,3 дні. Гэта тлумачыцца тым, што на ўсходзе Беларусі фальварачна-паншчынная сістэма ў першай палове XVII ст. не набыла такога інтэнсіўнага развіцця, як у заходніх частках дзяржавы[4, Пичета В. А. Аграрные реформы в восточных областях Литовско-Русского государства во второй половине XVI и в начале XVII в. // Белоруссия и Литва XV–XVI вв. М., 1961. С. 124].

Асноўнымі плацельшчыкамі чыншу былі чыншавыя ці кунічныя сяляне. Сплочвалі чынш і цяглыя, але памер грашовай рэнты ў грашовай рэнты ў гэтай катэгорыі сялян быў ніжэйшым.

Пры даследванні развіцця чыншавай павіннасці на Беларусі ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. неабходна мець на ўвазе, што грошы з цягам часу абясцэньваліся. З тае прычыны, рэальны і намінальны рост чыншу часам – абсалютна розныя лічбы. Калі ў 1545 годзе залаты дукат (чырвоны злоты) ацэньваўся ў 50 грошаў, дык у 1578 годзе – у 56, у 1598 г. – у 58, у 1611 г. – у 70, у 1620 г. – у 120, у 1622 г. – у 140, у 1628 г. – 160, у 1631 г. – у 165 грошаў [5, Рябцевич В. Н. О чём рассказывают монеты. Мн. 1977. С. 112. 127].

Ва ўсходняй Беларусі, дзе грашовая рэнта атрымала большае развіццё, чым у заходняй, памер яе рос як у рэальным, так і ў намінальным выражэннях. У кунічных сялян усходу чынш падняўся з канца XVI ст. да сярэдзіны XVII ст. намінальна ў 9, а насамрэч ў 2,7 разы [6, Голубеў В. Ф. Сялянскае зумлеўладанне і землекарыстанне на Беларусі ў XVI – XVIII стст. Мн. 1992. С. 121].

У другой палове XVI – першай палове XVII стст. чынш у сялян захаду і цэнтру Беларусі рэальна не толькі не павялічваўся, але часам нават і памяншаўся.

Аднак, якія б павіннасці эксплуатуемага сялянскага саслоўя не пераважалі, заўжды яе дапаўнялі натуральным аброкам. За другую палову XVI – першую палову XVII стст. ён значных змяненняў не меў. Інвентары аднатыпныя ў пераліку даніны: жыта, авёс, ячмень, гусі, куры, яйкі, мёд, сена, дровы, пянька і інш.

Кола дзяржаўных павіннасцей сялян Вялікага княства Літоўскага было акрэслена ўжо напрыканцы XIV стагоддзя. Яно ахоплівала гарадскія працы (пабудова і ўтрымання абарончых збудаванняў), прадуктовую даніну, грашовыя падаткі і ваенныя павіннасці. Выконваліся яны як дзяржаўнымі, так і прыватнаўласніцкімі сялянамі

Інвентары радзівілаўскіх уладанняў Непачылавічы, Радулічы даводзяць, што тут існавала змешаная адпрацовачна-чыншавая феадальная рэнта. З трыццаці валок сяла Непачылавічы дваццаць былі цяглымі, а астатнія дзесяць – кунічнымі. З кожнай цяглай валокі чыншу плацілі 5 коп, 24 грошы. Выплочвалі сяляне гэтага ўладання і натуральны аброк: 1 гуся, 1 курыцу, з усёй вёскі ялавіцу і іншыя прадукты. Паншчына адбывалася з валокі ў тыдзень 3 дні, у час жніва з дыма 1 дзень у тыдзень [7, Archiw główny aktów dawnych (AGAD) dz. XXV, №3480/1. ł.3–7].

Не меншую цікавасць уяўляе інвентар маёнтка Пеліканы Браслаўскага павета за 1622 год, які належаў вяльможнаму пану Янушу Тышкевічу, ваяводзе Мсціслаўскаму, старосце браслаўскаму. Сяло Пеліканы мела 20 валок, з якіх спаганяліся наступныя павіннасці: з адной валокі чынша 60 грошай; 1 бочку жыта, 1 бочку аўса, 1 курыцу; 3 разы на тыдзень выходзіць на палявыя працы [8, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), ф. 1727. воп. 1 спр. 4. л. 119–121 адв].

Як вядома, практыка закладвання землеўласнікамі сваіх уладанняў арандатарам мела шырокае распаўсюджанне ў Вялікім княстве Літоўскім ў першай палове XVII ст. Гэтаксама бясспрэчна і тое, што цяжар абкладання павіннасцямі часовых падданых быў значна большым. Менавіта ў такіх ўладаннях найбольшым была прага ў сялян да змагання за лепшую долю. Часам такія узброеныя выступленні заканчваліся на карысць прыгнятаючага саслоўя (4 гады падданыя Крычаўскага староства трымалі ўладу ў сваіх руках).

Маёнтак Тулава Віцебскага ваяводства быў закладзены ў арэнду панам Сцяпану і Восіпу Петкавічам на чатыры гады (з 1640 па 1644 гг.). Як вядома, пры перадачы зямельнай уласнасці іншаму трымальніку заўжды складаліся інвентарныя апісанні. Воласць Тулаўская новымі гаспадарамі была цалкам пераведзена на грашовы чынш. Яна змяшчала 3 дыма, якія плацілі па 12 коп, 3 дыма баярскіх , што выплочвалі 16 коп [9, Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. ф. 1177. воп. 1. спр. 6616. л. 2 адв.].

Такім чынам, сацыяльна-эканамічнае развіццё сялянства Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVII стст. мела свае лакальныя асаблівасці. Пасля правядзення аграрнай рэформы Жыгімонта II Аўгуста 1557 г. найбольшы імпульс развіццё фальварачна-паншчыннай сістэмы гаспадарання атрымаў захад і цэнтр Беларусі. Таму тут большае развіццё

набылі адпрацовачныя павіннасці. Узровень грашовага чыншу значна вырас ва ўсходнім рэгіёне, а ў заходне-цэнтральным фактычна заставаўся нязменным, ці дзе-нідзе нават зменшыўся. Прадуктовы аброк як ва ўсходнім, так і ў заходнім рэгіёнах Беларусі зменаў не пацярпеў.

### Літаратура


1. Archiw glówny aktów dawnych (AGAD). dz. XXV, №3480/1. ł. 3–7.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). ф. 1747. воп. 1. спр. 4. лісты 119–121 адв.
3. Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы.ф. 1177. воп. 1. спр. 6616. ліст 2 адв.
4. *Морzу J.* Kryzys demograficzny na Litwie i Białorusi w II połowie XVII wieku. Poznań, 1965.
5. *Голубеў В. Ф.* Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI – XVIII стст. Мн.,1992.
6. *Лойка П. А.* Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI – XVIII стст. Мн., 1991.
7. *Пичета В. А.* Аграрные реформы в восточных областях Литовско-Русского государства во второй половине XVI и в начале XVII в. // Белоруссия и Литва XV – XVI вв. М., 1961
8. *Рябцевич В. Н.* О чём рассказывают монеты. Мн., 1977.
9. *Спиридонов М. Ф.* Закрепощение крестьянства Беларуси. Мн., 1993.


## ПОЛИВАРИАНТНОСТЬ ИНТЕРПРЕТАЦИЙ ИСТОРИЧЕСКИХ ОСОБЕННОСТЕЙ ФОРМИРОВАНИЯ РОССИЙСКОГО ГОСУДАРСТВА КАК ПАРАДИГМА СОВРЕМЕННОЙ НАЦИОНАЛЬНОЙ ИСТОРИОГРАФИИ (НА ПРИМЕРЕ СЕВЕРНОГО КАВКАЗА)

**А. Н. Максимчик**

Парад суверенитетов начала 90-х гг. весьма негативно сказался на развитии исторической науки на Северном Кавказе. Развернувшаяся борьба кавказских этносов за обретение собственной государственности актуализировала территориальные проблемы, подняла вопросы о политическом, экономическом доминировании того или иного народа в многонациональных республиках. Стремление сохранить целостность территории Российской Федерации, наличие значительной доли русского населения на Кавказе и многочисленной кавказской диаспоры в России на долгие годы обеспечивают актуальность изучения проблем этого региона.

Здесь первостепенная и ответственная роль принадлежит историкам региона. Дело в том, что этническая психология и самосознание народов Северного Кавказа неразрывно связаны с их историей. Свойственное народам Кавказа уважение к предкам, глубина исторической памяти, зафиксированная не только в хронике, но и в исторических преданиях, ге-